УДК 811.161.3’373.611

А. У. Андрэева, дац., канд. філал. навук
(ІМСіТ БДУФК, г. Мінск)

# СТРУКТУРНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ ТУРЫЗМУ І ГАСЦІНІЧНАЙ ІНДУСТРЫІ

Актыўнае развіццё турызму ў Рэспубліцы Беларусь у апошнія гады вымагае інтэнсіфікацыі навучальнага працэсу, распрацоўкі і ўдасканалення вучэбных праграм і метадычных комплексаў, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, якія будуць садзейнічаць падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, здольных ажыццяўляць прафесійна арыентаваную камунікацыю на дзвюх дзяржаўных мовах. Невыпадкова адной з задач дзяржпраграмы развіцця турыстычнай індустрыі «Беларусь гасцінная» (2016 – 2020 гг.) абвешчана кадравае, навуковае і вучэбна-метадычнае забеспячэнне турызму. Відавочна, што для эфектыўнага ажыццяўлення навучальнага працэсу ў профільных вышэйшых і сярэдніх навучальных установах патрабуецца грунтоўнае вывучэнне нацыянальнай турыстычнай тэрміналогіі, яе ўпарадкаванне і сістэматызацыя.

Важна адзначыць, што на дадзены момант турыстычная тэрміналагічная лексіка застаецца маладаследаванай. Па-ранейшаму адсутнічаюць спецыялізаваныя слоўнікі і энцыклапедыі па індустрыі турызму і гасціннасці на нацыянальнай мове. У гэтай сувязі вывучэнне турыстычнай тэрміналогіі набывае асаблівую актуальнасць.

Матэрыялам для даследавання паслужыла навуковая, вучэбная і даведачная літаратура, прысвечаная пытанням турызму і гасціннасці.

Праведзены структурны аналіз эмпірычнага матэрыялу сведчыць, што ў межах тэрмінасістэмы “турызм і гасцінічны бізнес” вылучаюцца два структурныя тыпы спецыяльных найменняў, абодва з якіх шырока ў ёй прадстаўлены: тэрміны-словы (універбы) і тэрміны-словазлучэнні (полівербы). У сваю чаргу аднаслоўныя турыстычныя тэрміны згодна з класіфікацыяй В. П. Даніленка [1, с. 37] можна падзяліць на невытворныя, вытворныя (дэрываты) і складаныя (кампазіты).

Асноўную масу ўнівербаў складаюць невытворныя найменні, рэпрэзентаваныя тэрмінамі-назоўнікамі (*турызм*, *госць*, *гатэль, кемпінг, курорт, тур, трансфер, чартар, кейтэрынг, экскурсія*). Сярод невытворных тэрмінаадзінак прэвалююць запазычанні галоўным чынам з англійскай мовы. Дамінаванне тэрмінаў-англіцызмаў абумоўлена перш за ўсё экстралінгвістычнымі фактарамі: развіццё сферы турызму і гасціннасці адбываецца з арыентацыяй на



РЕПОЗИТОРИЙ БГУФК

замежны вопыт, пры гэтым турызм як сацыяльна-культурная і эканамічная з’ява характарызуецца высокім узроўнем развіцця менавіта ў англамоўных краінах. Таму англійскія тэрміны найбольш універсальныя і адпавядаюць патрэбам сучаснага этапу развіцця турызму і гасцінічнага бізнесу [2, с. 165].

Спецыфічнай рысай беларускай турыстычнай тэрміналогіі з’яўляецца тое, што ў ёй функцыянуе зусім невялікая па колькасці група вытворных тэрмінаадзінак. Гэта звязана з тым, што беларуская турыстычная тэрмінасістэма, якая яшчэ знаходзіцца на стадыі фарміравання, у асноўным запазычвае ўжо гатовыя аднаслоўныя адзінкі з іншых моў (пераважна з англійскай) разам з абазначаным імі новым паняццем ці з’явай. Ядро вытворных спецыяльных найменняў утвараюць суфіксальныя тэрміны, выражаныя назоўнікамі ці радзей дзеясловамі. Найбольшую прадуктыўнасць у групе тэрмінаў-субстантываў праяўляюць суфіксальныя марфемы ***-нн(е) / -энн(е)*** (*браніраванне, размяшчэнне*), ***-к(а)*** (*перавозка, паркоўка*), ***-асць*** (*гасціннасць, сезоннасць*), ***-нік*** (*наведвальнік, адпачывальнік*). Турыстычныя тэрміны-дзеясловы ўзнікаюць у выніку далучэння да субстантыўных асноў суфіксальных фармантаў ***-ава-***, ***-ірава-***: *браніраваць, рэгістраваць, рэзерваваць*. Прэфіксальныя тэрміны амаль не ўласцівы турыстычнай тэрмінасістэме і прадстаўлены асобнымі найменнямі, утворанымі ад адпаведных тэрмінаў-назоўнікаў пры дапамозе прыставак ***не-*** (*незаезд, няяўка*) ці ***звыш-*** (*звышбраніраванне*).

Значны пласт спецыяльных найменняў сферы турызму і гасціннасці складаюць кампазіты, прадуктыўнасць якіх тлумачыцца тэндэнцыяй моўнага развіцця: пры іх утварэнні не выкарыстоўваецца новы матэрыял, яны ствараюцца на базе існуючых лексем і могуць цалкам пакрываць паняційнае поле навуковай галіны. Бясспрэчная перавага складаных тэрмінаў заключаецца ў іх эканомнай і адначасова семантычна ёмістай (інфарматыўнай) структуры, што дазваляе ствараць кароткія па форме і аб’ёмныя па змесце тэрміны [3, с. 5]. Усе турыстычныя тэрміны-кампазіты ўяўляюць сабой субстантывы, утвораныя на базе прыметніка і назоўніка або двух назоўнікаў. Складаныя тэрмінаадзінкі характарызуюцца падпарадкавальнымі семантычнымі адносінамі матывавальных асноў: яны змяшчаюць апорны кампанент (назоўнік) і папярэднюю аснову прыметніка або назоўніка з удакладняльнай, азначальнай функцыяй. Сярод турыстычных складаных тэрмінаў высокую дэрывацыйную актыўнасць праяўляюць: 1) кампазіты, у якасці першага кампанента якіх выступае ўсечаная аснова прыметніка грэка-лацінскага паходжання (*агратурызм, аўтатурыст, экамаршрут, этнатур*);

2) утварэнні з нулявым інтэрфіксам, першым кампанентам якіх служыць назоўнік або радзей прыметнік (*бізнес-гатэль, кангрэс-круіз*).

Крыху больш за палову зафіксаваных спецыяльных найменняў складаюць тэрміналагічныя словазлучэнні. Прадуктыўнасць сінтаксічнага спосабу абумоўлена неабходнасцю дыферэнцыяцыі спецыяльных навуковых паняццяў. У турыстычнай тэрмінасістэме вылучаюцца двух-, трох- і шматлексемныя тэрміналагічныя словазлучэнні. Праведзенае даследаванне паказвае, што асноўная група тэрмінаў-словазлучэнняў прадстаўлена двухкампанентнымі адзінкамі, што ўяўляюць сабой іменныя (субстантыўныя) словазлучэнні. Сярод іх пераважаюць тэрміны з атрыбутыўным тыпам адносін, створаныя па мадэлях «прыметнік + назоўнік» і «назоўнік + назоўнік» на базе адносна невялікай групы базавых турыстычных тэрмінаў (*аглядная экскурсія*, *тэматычная экскурсія, гастранамічны тур, камбінаваны маршрут*). Фіксацыя ў межах турыстычнай тэрмінасістэмы нямалай колькасці шматкампанентных тэрмінаў апісальнага характару, што складаюцца з 4 і больш элементаў (*аплата па факце аказання паслуг, клубны адпачынак у рэжыме рэальнага часу, свабодны продаж паслуг сродкаў размяшчэння*), сведчыць аб «маладосці» беларускай тэрміналогіі, якая не з’яўляецца яшчэ канчаткова сфарміраванай.

У заключэнні адзначым, што ў сувязі з недастатковай вывучанасцю беларускай турыстычнай тэрміналогіі патрабуецца яе далейшае лінгвістычнае даследаванне як у структурным, так і ў семантычным плане.

ЛІТАРАТУРА

1. Даниленко, В. П. Русская терминология. Опыт лингвистического описания / В.П. Даниленко; Институт русского языка АН СССР. – М. : Наука, 1977. – 246 с.

2. Виноградова, Л. В. Терминология туризма английского и русского языков в синхронном и диахронном аспектах : дис. ... кандидата филол. наук : 10.02.19 / Л. В. Виноградова; Новгород. гос. ун-т им. Ярослава Мудрого. – Великий Новгород, 2011. – 213 с.

3. Кербер, Е. В. Особенности синонимии в немецкой экономической терминологии : автореф. … канд. филол. наук : специальность 10.02.04 / Е. В. Кербер; Омск. гос. тех. ун-т. – Белгород, 2011. – 23 с.